**Дзяржаўны дэпартамент ЗША**
**Справаздача аб гандлі людзьмі**
**2008 год**
**Беларусь (другая катэгорыя)**

Беларусь з'яўляецца краінай-крыніцай і краінай транзіту жанчын, якіх перапраўляюць з Беларусі ды суседніх краін у Расію, ААЭ, Ізраіль, Бахрэйн, Турцыю, Украіну, Японію і ў краіны Еўрапейскага Саюза, у тым ліку ў Германію, Польшчу, Чэшскую Рэспубліку, Фінляндыю, Літву і Кіпр для прымусовай працы і з мэтай камерцыйнай сэксуальнай эксплуатацыі. Мужчын і жанчын з Беларусі па-ранейшаму перапраўляюць у Расію для прымусовай працы. Невялікую колькасць беларусаў-ахвяр гандлю пераправілі з мэтай эксплуатацыі ў межах краіны.

Дзейнасць урада Беларусі не поўнасцю адпавядае мінімальным стандартам па выкараненні гандлю людзьмі, аднак урад прыкладае значныя намаганні для дасягнення гэтай мэты. У справаздачны перыяд беларускі ўрад праявіў заўважна большую палітычную волю да выкаранення гандлю людзьмі, аднак па-ранейшаму недастатковым было фінансаванне праграм, замацаваных заканаўча ў 2005 годзе і скіраваных на дапамогу ахвярам. У мінулым НДА, што змагаюцца супраць гандлю людзьмі, выказвалі незадаволенасць адсутнасцю абмена інфармацыяй і каардынацыі паміж ведамствамі, але на працягу 2007 года яны паведамлялі пра паляпшэнні ў гэтай вобласці.

Рэкамендацыі для Беларусі: павялічыць колькасць рэсурсаў, скіраваных на прадастаўленне дапамогі ахвярам і іх абарону ў межах Беларусі, у тым ліку праз падтрымку сведкаў; працягваць аптымізацыю адміністратыўных працэдур, звязаных з абаронай ахвяр; палепшыць адносіны з НДА, што змагаюцца супраць гандлю людзьмі; правесці спецыяльную падрыхтоўку службовых асобаў, неабходную для вызначэння, абароны, накіравання ахвяр да адпаведных сацыяльных службаў; распрацаваць мэтавыя праграмы прадухілення гандлю, скіраваныя на беларускіх грамадзян, што належаць да груп рызыкі.

## Судовы пераслед

У 2007 годзе ўрад Беларусі прадэманстраваў высілкі, скіраваныя на паляпшэнне эфектыўнасці праваахоўнай сістэмы ў барацьбе супраць гандлю людзьмі. Беларускі закон забараняе перапраўку людзей і з мэтай сэксуальнай эксплуатацыі, і для прымусовай працы, і ў якасці пакарання (Артыкул 181 Крымінальнага кодэкса) прадугледжвае пазбаўленне волі на тэрміны ад 5 да 15 гадоў. Такое пакаранне дастаткова жорсткае, параўнальнае з тымі, што прадугледжаныя за іншыя цяжкія злачынствы, напрыклад, згвалтаванне. На працягу справаздачнага перыяду ўрад па-ранейшаму выдаткоўваў значныя рэсурсы для выяўлення і расследавання гандлю людзьмі. Паводле статыстычных дадзеных Міністэрства юстыцыі, ў 2007 годзе беларускія ўлады расследавалі 84 злачынствы, звязаныя з гандлем людзьмі. З гэтай колькасці справаў 65 разглядаліся ў судзе, было вынесена 39 абвінаваўчых выракаў.

Усе яны прадугледжвалі ў якасці пакарання пазбаўленне волі. У межах спраў было вызначана 378 ахвяр (у тым ліку 22 непаўналетніх) сэксуальнай эксплуатацыі і 40 ахвяр (у тым ліку 1 непаўналетняя) эксплуатацыі, звязанай з прымусовай працай. У 2007 годзе ў акадэміі міліцыі краіны ўрад заснаваў цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы супрацьдзеяння гандлю людзьмі, у якім хаця б па аднаму спецыялісту для кожнага з усіх 156 раённых аддзелаў беларускай міліцыі, а таксама афіцэры з некалькіх суседніх краін праходзяць падрыхтоўку ў сферы прававога процідзеяння гандлю людзьмі, вызначэння ахвяр і прадастаўлення ім дапамогі. Міністэрства ўнутраных спраў выдаткавала 90 адсоткаў сродкаў, неабходных для заснавання ўстановы, і распрацавала дыдактычныя матэрыялы разам з мясцовай НДА, што займаецца прадастаўленнем дапамогі ахвярам.

**Абарона**

На працягу справаздачнага перыяду дзеянні ўрада Беларусі па абароне ахвяр і прадастаўленні ім дапамогі былі недастатковымі. Хаця ўрад прадаставіў сціплую неграшовую падтрымку НДА, што змагаюцца супраць гандлю людзьмі, - напрыклад, прадаставіў будынак для выкарыстання ў якасці прытулку для ахвяр гандлю- ён не фінансаваў праграмы, замацаваныя заканаўча ў 2005 годзе і скіраваныя на дапамогу ахвярам. Бальшыня ахвяр не звяртаюцца па медыцынскую дапамогу ў дзяржаўныя медыцынскія ўстановы, не жадаючы прадастаўляць інфармацыю супрацоўнікам паліклінік і бальніц. НДА па-ранейшаму сутыкаліся з празмерна грувасткімі працэдурамі атрымання афіцыйнага дазволу на праекты, што ёсць адным са складнікаў асяроддзя, у якім існуюць усе беларускія НДА, хаця НДА адзначылі паляпшэнні ў некаторых бюракратычных працэдурах. МАМ паведаміла, што ў мінулым годзе арганізацыя нашмат лягчэй атрымлівала дазволы на свае праекты і што бюракратычныя працэдуры сталі значна менш працяглымі і заблытанымі. Указ 2005 года, скіраваны супраць гандлю людзьмі, прадугледжвае кампенсацыю гандлярамі ўраду ўсіх выдаткаў на прадастаўленне дапамогі ахвярам, аднак судовыя працэдуры выканання гэтых палажэнняў складаныя і грувасткія. Беларускі закон дазваляе ўладам прадастаўляць замежным ахвярам права на часовае знаходжанне на сваёй тэрыторыі. У студзені 2008 года служба міграцыі прадаставіла ўкраінскаму дзіцяці права на часовае знаходжанне і прытулак у Беларусі. НДА паведамляюць, што юрыдычныя правы ахвяр захоўваюцца. Ахвяры гандлю не нясуць адказнасці за супрацьзаконныя дзеянні, што сталі непасрэдным вынікам іх перапраўкі. Некалькі НДА паведамілі пра змяншэнне колькасці выпадкаў, калі службовыя асобы прымушалі ахвяр выступаць ў судзе ў якасці сведак, хаця па-ранейшаму паступалі паведамленні пра тое, што некаторых ахвяр вымушаюць супрацоўнічаць са следствам. Мясцовыя НДА паведамляюць, што часам ахвяры сутыкаюцца з прадузятым і варожым стаўленнем да сябе з боку некаторых супрацоўнікаў праваахоўных органаў, асабліва ў меншых гарадах, і што высілкі, скіраваныя да дапамогу сведкам, па-ранейшаму сутыкаюцца з праблемай адсутнасці фінансавання.

**Прадухіленне**

У 2007 годзе беларускі ўрад дэманстраваў узмацненне намаганняў, скіраваных на азнаямленне грамадзян з праблемай гандлю людзьмі і яго прадухіленне. У красавіку 2007 года Міністэрства ўнутраных спраў правяло ў Мінску з удзелам прадстаўнікоў 30 краін канферэнцыю па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва праваахоўных устаноў у барацьбе супраць гандлю людзьмі. Урад прыняў нацыянальны план дзеянняў на 2008-2010 гг., закліканы павялічыць высілкі, скіраваныя на абарону і рэабілітацыю ахвяр гандлю людзьмі, падвысіць эфектыўнасць намаганняў урада па прадухіленні гандлю, удасканаліць заканадаўства ў вобласці процідзеяння гандлю і паменшыць распаўсюд прастытуцыі. На працягу 2007 года афіцыйныя асобы правялі 14 прэс-канферэнцый і 13 брыфінгаў з мэтай падвышэння ўзроўню ўсведамлення грамадзянамі праблемы гандлю людзьмі. Урад Беларусі падтрымаў 61 размяшчэнне адпаведнай інфармацыі ў праграмах тэлебачання і 108 размяшчэнняў на радыё. У дадатак, Міністэрства ўнутраных спраў адсочвала з’яўленне ў рэкламных СМІ магчымых аб’яваў аб найме з мэтай гандлю людзьмі. МАМ паведамляе, што ўлады забяспечваюць бясплатнае размяшчэнне адпаведных інфармацыйных паведамленняў арганізацыі сродкамі вонкавай рэкламы на тэрыторыі ўсяго Мінска. Міністэрства ўнутраных спраў па-ранейшаму прымала тэлефанаванні па інфармацыйнай гарачай лініі для патэнцыйных ахвяр, хаця і абмяжоўвала мэты такой працы прадастаўленнем інфармацыі, што тычыцца законнасці дзеянняў арганізацый, якія займаюцца ўладкаваннем грамадзян на працу і навучанне за мяжой. Міністэрства прызнавала, што гарачыя лініі, якія вядуць НДА, больш эфектыўныя ў прадастаўленні шырэйшага спектра паслуг, і накіроўвала тых, хто тэлефануе, на такія гарачыя лініі. Паступалі паведамленні пра тое, што некаторыя захады беларускага ўрада, абвешчаныя як крокі, скіраваныя супраць гандлю людзьмі, напрыклад, узмацненне кантролю за вандроўкамі за мяжу студэнтаў ды іншых катэгорый людзей, неналежна абмяжоўвалі магчымасці беларускіх грамадзян ездзіць за мяжу з законнымі мэтамі.